УДК 811.161.3

**А. Д. Цеплякова**

# СУБСТЫТУЦЫЯ КАМПАНЕНТАЎ КРЫЛАТЫХ ВЫРАЗАЎ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЕ

В статье рассматриваются разновидности субституции компонентов крылатых выражений в современном белорусском литературном языке.

The article examines the variety of substitution of components winged words in modern Belarusian literary language.

*Ключевые слова*: белорусский язык, крылатые выражения, субституция.

*Key words*: Belarusian, winged words, substitution.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Субстытуцыя – гэта падстаноўка (або замена) якіх-небудзь кампанентаў унутры крылатых слоў у маўленні. Субстытуцыя з'яўляецца адным з найбольш распаўсюджаных трансфармацыйных прыёмаў. Замена аднаго ці некалькіх кампанентаў можа адбывацца на розных узроўнях арганізацыі выразу – фанетычным, лексічным, структурным, у залежнасці ад гэтага можна вылучыць наступныя віды субстытуцыі.

**1. Фанетычная субстытуцыя** заснавана на сугучнасці слоў (замена гуку (гукаў) і інш.), мэтай якой з'яўляецца стварэнне эфекту каламбура, напр.: ***Біць альбо не біць*** [Назва верша]. (В. Ж.) – параўн.: *Быць або (ці) не быць <вось у чым пытанне>* (замена каранёвых галосных [ы] на [і]); ***Піць ці не піць?*** [Назва артыкула]. (Вож., 1999, № 2, с. 9) – параўн.: ***Быць** або (ці) не **быць** <вось у чым пытанне>* (замена каранёвых зычных [б] на [п] і каранёвых галосных [ы] на [і]) (тут фанетычная субстытуцыя спалучаецца са зменай модуса паведамлення); *– Ат, і не гавары, – махнуў адчайна рукою Сакалоў. – Цяжка, браце ты мой, жыць, калі **"адзін за ўсіх, а ўсе – на аднаго"**... – Як гэта разумець? – асцярожна ўдакладніў я.* (Вож., 1982, № 10) – параўн.: *Адзін за ўсіх <і> усе за аднаго* (замена зычных [з] на [н]).

**2. Лексічная субстытуцыя** можа быць прадстаўлена ў выглядзе замены асобных лексічных кампанентаў або спалучэнняў слоў і мае наступныя разнавіднасці.

**2.1. Замена асобнага слова на адно слова.** Напр.: ***Здыміся, імгненне!*** [Назва артыкула]. (К-ра, 19-25.06.1999) – параўн.: ***Спыніся**, імгненне! <Ты цудоўнае!>*; ***Джэнтэльмены таксама плачуць.*** [Назва артыкула]. (Н-кі, 2001, № 2) – параўн.: ***Багатыя** таксама плачуць*; ***Свята, якое заўсёды з намі*** [Назва артыкула]. (ЛіМ, 1999, № 43) ) – параўн.: *Свята, якое заўсёды з **табой***; ***Добра смяецца той, хто смяецца разам з усімі***. (Вож., 1985, № 4) – параўн.: *<Добра> смяецца той, хто смяецца **апошні (апошнім)***; *Вызначэньне слова "дача" ў беларускім тлумачальным слоўніку пры канцы XX стагодзьзя ўспрымаецца з тужлівай іроніяй: "Загарадны дом для адпачынку гараджан". Які адпачынак?!! Сёньняшні **"гома дачнікус"** штурмуе зь вёдрамі і торбамі электрычкі. Ягоная ідэалёгія ўнікальная па сваёй прастаце: "Працаваць трэба". Гэтыя людзі ўважаюць, што адпачываць на ўчастку проста непрыстойна. Няшчасныя пяць сотак засланяюць для іх увесь сьвет. Тэатры, кіно, прагулкі зь дзецьмі на выходных, выезды на прыроду засталіся недзе там, у пераддачным жыцці.* (В. Ц.) – параўн.: *гома **сапіенс***; ***Грошы не валяюцца**,* але вы шукайце. (Вож., 1997, № 5) – параўн.: *Грошы не **пахнуць**.*

**2.2. Замена аднаго слова на некалькі слоў.** Напр.: *[Ціхан:] – Не чапіся, Шатун, да чалавека, бо зноў абстрыгуць без суда і следства. [Шатун:] – Таму што **іхняя секта – опіум для народа!** Можа, я праз яе піць пачаў!*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Можа, у мяне тры дні свінні някормленыя!* (А. П.) – параўн.:. ***Рэлігія*** *– опіум <для> народа* (тут лексічная субстытуцыя спалучаецца са зменай модуса паведамлення); *Мы зрабілі для "народных абраньнікаў" усё, што маглі. Мы далі ім магчымасьць спакойна працаваць. У іх была ўпэўненасьць у тым, што іх ня "вынесуць" з Авальнай залі, як некалі апазыцыю БНФ.* ***Начная плошча мела*** *сваe* ***вочы, вушы й голас****, каб у выпадку "вынасу" ўбачыць і паклікаць на дапамогу.* (НН, 02.12.1996) – параўн.: ***І*** *сцены* *маюць* ***вушы*** (тут лексічная субстытуцыя спалучаецца з элімінацыяй асобных лексічных кампанентаў, канкрэтызацыяй і марфалагічнай трансфармацыяй).

**2.3. Падвоеная замена аднаго слова на другое**. Напр.: *Акурат перада мной стаялі кабеты далёка ўжо не бальзакаўскага веку й* ***мужчына Бальзакавага выгляду****.* (НН, 2000, № 51) – параўн.: ***жанчына*** *бальзакаўскага* ***ўзросту****; Я не ведаю, чаму вас не кратае нічога. Няўжо не баліць усё тое, што робіцца наўкола. Дальбог, ну – я не ўтраплю сабе, як гэта людзям удаецца так ёмка астудзіць свае пачуцці... Разганяюць з фабрык рабочых, арыштоўваюць забастоўшкаў, судзяць на смерць людзей, а ім хоць бы што – ліквідатарства... Мэрам так і трэба. Тут, па-мойму, ніводнай хвіліны не трэба чакаць.* ***Лепш памерці ў змаганні, чымсь жыць у няволі****...* (Ц. Г.) – параўн.: *Лепш памерці* ***стоячы****, чым жыць* ***на каленях****;* ***Здань б л у к а е па Еўропе – здань камунізму****...* (Маніфест Камуністычнай партыі). [Эпіграф да 1-й главы 3-й часткі]. (М. Гарэцкі, "Віленскія камунары") – параўн.: ***Прывід ходзіць*** *па Еўропе,* ***прывід*** *камунізму; Аднак узгаданая канферэнцыя ўшчэнт разбівае складзены стэрыатып. Удзельнікі – гісторыкі і філолагі – адзінадушна заўважылі, што канферэнцыя ўдалася, а літаратурны арыстакрат,* ***рыцар свабоды і сумлення*** *Уладзімір Караткевіч паўстаў ва ўсёй сваёй шматграннай творчай натуры.* (ЛіМ, 2001, № 16) параўн.: *рыцар* ***плашча і шпагі****; Па шчырасці, я ніколі не думаў, што табе захочацца слухаць пра чыста мужчынскія справы, пра забойствы і вайну, пра Шэкспірава "Быць ці не быць?", якое для мужчыны гучыць інакш...* ***Забіваць альбо не забіваць?*** *А для жанчыны...* ***Нараджаць ці не нараджаць?*** (А. Г. 1) – параўн.: ***Быць*** *або (ці)* ***не быць*** *<вось у чым пытанне>* (тут лексічная субстытуцыя спалучаецца са зменай модуса паведамлення).

Кампаненты крылатага выразу, якія замяняюцца, могуць належаць да адной часціны мовы, пры гэтым захоўваюцца іх парадыгматычныя формы, напр.: *[Правадыр:] – Глупства! Вызваляю цябе ад прысягі! [Міністр:] – Я прысягаў Айчыне, Бацькаўшчыне, а не табе! [Правадыр:] –* ***Бацькаўшчына – гэта я!*** *Усё астатняе – цьфу!* (М. М. 1) – параўн.: ***Дзяржава*** *– гэта я!; [Дзяніс:] – Пойдзем працаваць без штаноў. [Сяргей:] – Гэй вы! Дыверсанты! Гангстэры!* ***Паўцарства за штаны!*** (А. Дз. 1) – параўн.: *<Каня! Каня!> Паўцарства за* ***каня!***



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Лексічная субстытуцыя вельмі часта суправаджаецца марфалагічнай трансфармацыяй, напр.: *Казаць пра сукупнасьць прадуктаў у краме або сукупнасьць дзеяньняў па прыборцы кватэры язык не паварочваецца. І тут прыходзіць на дапамогу комплекс. Цэляфанавае слова "комплекс" надзвычай прыйшлося да рота. Сьвінарнікі ператварыліся ў сьвінакомплексы, заходы – у комплекс мерапрыемстваў, сталі комплекснымі лячэньне і абеды. Мы аглядалі мэмарыяльныя комплексы, а пасьля кіраваліся да комплексаў спартовых. Нават зьняволенныя пачалі адчуваць комплекс віны. Гэтак моўная сынтэтыка паступова зьмяншала наш слоўнікавы запас да дзесятку штампаў, у якіх каралём выступаў комплекс. Тады і загаварылі пра комплекс непаўнавартасьці, які пазьней назавуць* ***комплексам саўка****... Комплекс служыў ілжывай прапагандзе і самападману.* (С. Д.) – параўн.: *комплекс* ***непаўнавартасці****; Па вайне забесьпячэньне масаў жыльлём стала магутнай псыхатэрапіяй для панішчаных гарадоў і вёсак. За тлумам новабудоўляў забываліся жахі вайны і Курапатаў. Пад фанфары перарэзваліся чырвоныя стужкі, і на вачах у зьняможанага народу паўставалі дамы-палацы. Тады* ***будавалі на шырокую нагу****. Пра нарматывы кватэрных плошчаў не дбалі.* (С. Х.) – параўн.: *<**жыць**> на шырокую нагу.*

**3. Субстытуцыя структурных частак**. Напр.: *[Прыдворны:] –* ***Кароль памёр!*** *[Арцыбіскуп:] –* ***Вітаем каралеву!*** (А. Д. 2) – параўн.: *Кароль памёр!* ***Няхай жыве кароль!***

**4. Камбінаваная субстытуцыя**, калі розныя віды субстытуцыі могуць спалучацца адна з адной. Часцей за ўсё спалучаюцца **лексічная субстытуцыя і субстытуцыя структурных частак.** Напр.: *Яны падышлі да вялікага новага дома на праспекце, і гэта чамусьці канчаткова пераканала Лемяшэвіча, што Дар'я Сцяпанаўна – жанчына замужняя. Ён пажартаваў: –* ***Скажыце, дзе вы жывеце, і я скажу, хто вы****, так здаецца?* (Шам. 3) – параўн.: *Скажы <мне>,* ***хто твае сябры (твой сябра)****, <і> я скажу, хто* ***ты*** (тут камбінуюцца лексічная субстытуцыя і субстытуцыя структурных частак у спалучэнні з дзеяслоўнай марфалагічнай трансфармацыяй).

**5. Спалучэнне субстытуцыі з іншымі трансфармацыйнымі прыёмамі** (найчасцей сінтаксічнымі). Напр.: *Такое пытанне паўстала пасля канферэнцыі ў доме Друку, дзе выступіла ўрач-нарколаг <...>.* ***Піць ці не піць – справа кожнага асабістая****.* (Вож., 1996, № 6) – параўн.: ***Быць*** *або (ці) не* ***быць*** *<вось у чым пытанне>* (тут фанетычная субстытуцыя спалучаецца з анексіяй); ***Прывід пэнсійнай рэформы ўжо каторы год б л у к а е па раўнінах, узвышшах і нізінах краіны.*** (Н-кі, 2002, № 21) – параўн.: *Прывід ходзіць па Еўропе,* ***прывід камунізму****.* (тут лексічная субстытуцыя спалучаецца з элімінацыяй асобных лексічных кампанентаў і ўстаўкай).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова